Менавіта для таго, каб матэрыяльна заахвоціць кандыдатаў з ліку рускіх землеўладальнікаў, І. Каханаў у 1884–1886 гг. неаднаразова ўздымаў перад Міністэрствам унутраных спраў пытанне аб аднаўленні ў Паўночна-Заходнім краі асобных з'ездаў міравых пасрэднікаў у кожным павеце, а пасаду старшыні міравога з'езда, які атрымоўваў жалаванне, зноў аб'яднаць з пасадай павятовага прадвадзіцеля дваранства. Гэта была палітычная праблема, вырашэнне якой садзейнічала б паспяховай рэалізацыі палітыкі русіфікацыі края. Сваю пазіцыю І. Каханаў падмацоўваў і сацыяльна-эканамічнымі аргументамі. Ён сцвярджаў, што «*восстановление самостоятельных съездов [міравых пасрэднікаў – рэд.] в каждом уезде ускорит во вверенном ему крае окончание крестьянских дел, равно как и дел о вольных людях и чиншевиках*»[1].

Пасля неаднаразовых абмеркаванняў названага пытання ў Камітэце міністраў і Дзяржаўным савеце 30 мая 1888 г. Аляксандр III зацвердзіў меркаванне Дзяржаўнага савета аб аднаўленні самастойных павятовых з'ездаў міравых пасрэднікаў у Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губернях[2]. У выніку ўсе павятовыя прадвадзіцелі дваранства рымска-каталіцкага веравызнання былі заменены праваслаўнымі. Такая сітуацыя захавалася да 1904 г., калі на ўказаныя губерні быў распаўсюджаны закон ад 12 ліпеня 1889 г., па якім інстытут міравых пасрэднікаў скасоўваўся, а функцыі пасрэднікаў былі перададзены земскім начальнікам. Пры гэтым пасады старшынь павятовых з'ездаў земскіх начальнікаў занялі прадвадзіцелі дваранства з акладам у 2500 руб.[3]

## 4.2. Губернскія і павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці

*(С.А. Талмачова)*

Для рэалізацыі рэформы 19 лютага 1861 г. і канчатковага вырашэння спрэчак паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі сялянамі ствараліся **губернскія па сялянскіх справах прысутнасці**. Іх

[1] РДГА. – Ф. 1291. Воп. 38. Спр. 20. Арк. 69.

[2] Жытко А., Талмачова, С. Палітыка самадзяржаўя ў адносінах да інстытута павятовых прадвадзіцеляў дваранства на беларускіх землях (1861–1914 гг.) / А. Жытко, С. Талмачова // Беларус. гістар. часопіс. – 2013. – № 4. – С. 4–13; РДГА. – Ф. 1291. Воп. 38. Спр. 20. Арк. 80–84.

[3] ПСЗРИ. Собр. 3-е. – Т. 23 (1903). – Отд. 1. – № 23106. – С. 687–689.

склад, парадак утварэння, функцыі, паўнамоцтвы і парадак дзейнняў вызначаліся на падставе «Положения о губернских и уездных по крестьянским делам учреждений»[1].

У склад губернскай прысутнасці ўваходзілі: губернатар (старшыня), губернскі прадвадзіцель дваранства, кіруючы палатай дзяржаўных маёмасцей, губернскі пракурор, два члены з мясцовых дваран, якіх запрашалі па ўзгадненні з губернатарам і міністрам унутраных спраў, а таксама два члены з мясцовых дваран-памешчыкаў, выбраныя дваранскімі сходамі. Пры разглядзе пытання аб выкупе сялянамі палявых угоддзяў на пасяджэнні прысутнасці запрашаўся ў якасці члена старшыня казённай палаты, а ў выпадку неабходнасці і неадменны член Міністэрства фінансаў[2].

Рашэнні губернскай прысутнасці прымаліся простай большасцю галасоў. У спрэчных сітуацыях старшыня меў вырашальны голас. У асабліва важных выпадках губернатар меў права затрымаць выкананне рашэння губернскай прысутнасці і перадаць на разгляд міністра ўнутраных спраў.

Губернская па сялянскіх справах прысутнасць мела канцылярыю, распарадчае, выкупное, люстрацыйнае, чыншавое, а з 1867 г. і страхавое аддзяленні. Канцылярыя складала пратаколы пасяджэнняў, назірала за выкананнем указаў і пастаноў урада і губернскіх улад, кіравала працай служачых, вяла гаспадарчыя справы.

Распарадчае аддзяленне займалася пазямельнымі адносінамі памешчыкаў і сялян, выступленнямі сялян супраць памешчыкаў, спагнаннем падаткаў, земскіх і мірскіх збораў, арганізацыяй і наглядам за дзейнасцю сялянскага саслоўнага самакіравання, разглядала скаргі сялян на рашэнні міравых пасрэднікаў, міравых з’ездаў, павятовых па сялянскіх справах прысутнасцей, службовых асоб валаснога і сельскага самакіравання і г. д.

Выкупное аддзяленне вяло справы аб выкупе сялянамі зямлі з памешчыцкіх і казённых маёнткаў, увядзенні і зацвярджэнні ўстаўных грамат, зацвярджала планы маёнткаў, паселішчаў і ся-

[1] ПСЗРИ. Собр. 2-е. – Т. 36 (1861). – Отд. 1. – № 36660. – С. 202–218.

[2] Талмачова, С. А. Дзейнасць губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях па рэалізацыі аграрнай палітыкі ўрада (1878–1901 гг.) / С. А. Талмачова // Беларус. гістар. часоп. – 2015. – № 11. – С. 29–38.